**КАЎГАНЮК** Сцяпан Пятровіч [13(26).4.1902, с. Анапрыеўка Тальноўскага р-на Чаркаскай вобл.— 23.8.1982], украінскі сав. пісьменнік, перакладчык. Удзельнік Айч. вайны. Аўтар зборніка апавяд. «Манеўры» (1931), кн. «Практыка перакладу» (1968). На ўкр. мову пераклаў шэраг апавяданняў В. Каваля (зб. «Жніво», 1930), раман І. Шамякіна «Крыніцы» (1959).

**КАЎТУНО́ВА** Марыя Паўлаўна [н. 3(16).11. 1915, в. Неглюбка Веткаўскага р-на], беларускі сав. майстар народнага мастацкага ткацтва. Жыве і працуе ў Неглюбцы. Удзельнічае ў маст. выстаўках з 1972. Працуе ў тэхніцы закладнога і пераборнага ткацтва. Вырабляе ручнікі, посцілкі ў традыцыях мясц. ткацтва. Лаўрэат 1-га Усесаюзнага фестывалю самадз. творчасці працоўных (1975—77). Ручнікі К. зберагаюцца ў музеях БССР і многіх замежных краін. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Неглюбскія ручнікі.*

**КАЎЧЭ́Г** у абразе, заглыбленая паверхня дошкі, дзе змяшчалася кампазіцыя. Рабіўся на адлегласці 2—7 см ад краёў на глыбіню 2—3 мм. На Беларусі сустракаецца ў абразах канца 14— пач. 16 ст.: «Маці боская Заміласванне» (канец 14 — пач. 15 ст.), «Маці боская Адзігітрыя Смаленская» (канец 15 ст.), «Маці боская Прадвесце» (канец 15— пач. 16 ст.; усе з Брэстчыны) і інш.

**КА́ФЛЯ** (ад ням. Kachel), керамічны выраб для абліцоўкі і дэкар. аздаблення печаў, камінаў і інш.; уяўляе сабой плітку, тыльны бок якой мае выгляд адкрытай каробкі (румпы) для замацавання ў муроўцы. Паводле форм і прызначэння К. падзяляюцца на сценныя, вуглавыя, паясовыя, карнізныя, а таксама кароны, дахоўкі, балясіны, медальёны і інш. Паводле маст. аздаблення К. бываюць гладкія і рэльефныя, тэракотавыя і глазураваныя празрыстай ці каляровай глазурай, размаляваныя. На Беларусі выраб К. пашыраны з 14 ст. У дэкоры выкарыстоўвалі геам., раслінныя, анімаліст. матывы, партрэтныя і геральдычныя адлюстраванні, выявы міфалаг. персанажаў, сюжэтныя сцэны і інш. Выкарыстанне К. розных памераў, колераў, відаў дэкору ў разнастайных спалучэннях давала магчымасць будаваць печы і каміны розных тыпаў і памераў, адпаведных пэўнаму арх. і маст. стылю. Выраблялiся спачатку ўручную



Фрыз з малюнкам «павіна вока» работы С. Палубеса. Фрагмент. Царква Грыгорыя Неакесарыйскага. Масква. 1669.









Да арт. Кафля. Уверсе: аздабленне кафлянай печы ў сядзібным доме вёскі Агарэвічы Ганцавіцкага раёна. Канец 19 — пач. 20 ст. (злева). Крычаўская кафля з геральдычнай выявай. 17 ст. Унізе: заслаўская кафля. 16—17 ст. (злева). Кафля з Івянца. Канец 19 — пач. 20 ст.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

на ганчарным крузе, пазней у гліняных, драўляных, гіпсавых формах. Сфармаваныя К. высушвалі і абпальвалі ў ганчарных горнах і печах. К. часта няправільна называюць *пліткі дэкаратыўныя* без румпы на тыльным баку.

К. вядома ў краінах Еўропы з 8 ст. На Беларусі ў 14—18 ст. К. выраблялі раменнікі-ганчары, з 18 ст. кафлярства вылучылася ў асобную галіну прамысловасці. У 14—16 ст. выраблялі гаршковыя К. з вусцямі разнастайных канфігурацый (круглыя, квадратныя, трохвугольныя і інш.), дно зрэдку дэкарыравалі. Памеры: 2—40 см вышынёй, 5—20 см у дыяметры. Найб. раннія К. выраблялі з нятлустай глінянай масы з дамешкамі буйной жарствы, пазней К. фармавалі на ганчарным крузе з тлустых гліняных мас. З 15 ст. выраблялі каробчатую К., для ранніх тыпаў якой характэрны высокія рамка і круглая румпа, прымацаваная да квадратнай пласціны; больш познім К. характэрны невысокая румпа і вялікая квадратная або прамавугольная пласціна. У 15 ст. ў аздабленні К. пашыраны геам. матывы (салярныя знакі, кругі, квадраты і інш.), з канца 15 ст. таксама рэльефныя выявы раслін, жывёл, сюжэтныя кампазіцыі на бытавыя, гіст., міфалаг., рэліг. тэмы. З 16 ст. пашырана вытв-сць паліхромнай, глазураванай зялёнай палівай К. (т. зв. мураўленай), рэльефныя пласціны якой фармавалі з дапамогай гліняных і драўляных гравіраваных форм. У дэкоры пашыраны раслінныя (найчасцей букет кветак у вазе) і геам. кампазіцыі, анімаліст. тэматыка, дзе рэаліст. выявы звяроў і птушак спалучаліся са стылізаванымі адлюстраваннямі міфалаг. істот (грыфон і інш.). У канцы 16— пач. 17 ст. бел. кафлярства дасягнула найб. росквіту. Значнымі маст. якасцямі вызначалася паліхромная К., глазураваная белай, жоўтай, светла- і цёмна-зялёнай, блакітнай, цёмна-сіняй, карычневай палівай. У аздабленні К. (асабліва ў 17 — пач. 18 ст.) пераважае раслінная і геральдычная тэматыка (дзярж., гарадскія, цэхавыя, прыватнаўладальніцкія гербы). Геральдычныя кампазіцыі складаліся, як правіла, з выяў картушаў, шчытоў, раслін, жывёл, уключалі надпісы (тэкст, асобныя лац. або кірылаўскія літары, лічбы, часам год вырабу К.). З 2-й пал. 17 ст. выраблялі К. ў т. зв. дывановым стылі, дзе малюнак быў падпарадкаваны сеткавай арнаментальнай схеме і кожная асобная К. складала частку агульнага малюнка. Дэкор 17—18 ст. адметны рысамі стылю барока. Бел. кафлярства 17 ст. значна ўплывала на развіццё вытв-сці К. ў Рус. дзяржаве, дзе працавалі бел. майстры І. Максімаў, П. Фёдараў, С. Аляксееў і інш. з Копысі, С. Іваноў (С. *Палубес*) з Мсціслава, майстры з Дуброўны, Віцебска і інш. гарадоў Беларусі. Фрызамі, ліштвамі, устаўкамі, карнізамі і інш. вырабамі работы бел. майстроў аздоблены Церамны палац Крамля, Круціцкі церам, царква Грыгорыя Неакесарыйскага ў Маскве, Васкрасенскі сабор Новаіерусалімскага манастыра на Істры і інш. Асн. ўзор быў раслінны (т. зв. «павіна вока»). У 18 ст. памеры К. павялічыліся, мадэліроўка рэльефаў ускладнілася. Выкарыстанне гіпсавых форм палепшыла якасць вырабаў і культуру вытв-сці. У аздабленні печаў і камінаў, якія рабілі ў выглядзе ярусных цыліндраў, арх. збудаванняў, абеліскаў і інш. на багата дэкарыраваных цокалях, выкарыстоўвалі вял. К.-ўстаўкі з гарэльефнымі выявамі раслін, жывёл, чалавека і інш. Шырока выкарыстоўвалі гладкія, размаляваныя кобальтам К. т. зв. галандскага тыпу. У размалёўцы пераважалі адлюстраванні гіст., батальных, жанравых сцэн, пейзажаў, зробленых паводле карцін замежных і мясц. мастакоў, кніжных ілюстрацый, абразоў, вырабаў дэкар.-прыкладнога мастацтва. Побач з эмалямі ў размалёўцы часта выкарыстоўвалі золата. Белую гладкую і размаляваную К. выраблялі ў Целяханах (Івацэвіцкі р-н). На працу ў кафляныя мануфактуры з канца 18 ст. запрашалі і замежных майстроў. К. канца 19 — пач. 20 ст. вызначалася рысамі стылю *«мадэрн»* і мела форму рэльефных паліхромных чатырохвугольных плітак або фасонных дэталей (медальёнаў, карыятыд, ільвіных галоў і інш.). У той час на Беларусі працавалі кафляныя з-ды ў Бабруйску, Барысаве, Віцебску, Івянцы, Копысі, Мінску, Магілёве, Навагрудку, Слаўгарадзе і інш., прадукцыя якіх забяспечвала ўнутр. рынак і экспартавалася. У БССР паліваную К. выпрабляе кафляны цэх Аршанскага камбіната сілікатных вырабаў. Гл. таксама арт. *Віцебская кафля, Гродзенская кафля, Заслаўская кафля, Зэльвенская кафля, Копыская кафля, Магілёўская кафля, Мінская кафля, Мірская кафля, Мсціслаўская кафля.* Іл. гл. таксама на ўкл.

*Літ.:* Абецедарский Л. С. Белорусы в Москве XVII в.— Мн., 1957; Богоявленский С. К. Научное наследие: О Москве XVII века.— М., 1980; Трусаў А., Угрыновіч У. Беларуская паліхромная кафля.— Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1983, № 4.

*А. А. Трусаў, У. В. Угрыновіч.*

**«КАХА́НАЧКА»,** бальны танец. Створаны ў пач. 20 ст. рус. балетмайстрам М. Гаўлікоўскім. На Беларусі атрымаў даволі значнае пашырэнне ў сялянскім побыце, спарадзіў шэраг харэагр. мадыфікацый. Выконваецца парамі па крузе слізготным крокам. Адзін з характэрных момантаў: партнёры, стоячы тварам адзін да аднаго, ударающца спачатку




Танец «Каханачка».

правымі, потым, пасля пляскання ў далоні, левымі рукамі. Муз. памер 2/4. Тэмп умераны. Сцэнічны варыянт танца «Полька-каханачка» створаны балетмайстрам В. Партным.

*Л. К. Алексютовіч.*

**КАХАНО́ЎСКІ** Генадзь Аляксандравіч (н. 8.1.1936, в. Дамашы Маладзечанскага р-на), беларускі сав. гісторык і краязнавец. Канд. гіст. н. (1979). Чл. КПСС з 1974. Скончыў Маскоўскі пед. ін-т імя У. І. Леніна (1963). З 1964 навук. супрацоўнік, нам. дырэктара, дырэктар Мінскага абл. краязнаўчага музея (Маладзечна), з 1982 навук. супрацоўнік Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Даследуе развіццё археалогіі, музейнай справы, пытанні аховы помнікаў на Беларусі. Аўтар літаратурна-краязнаўчых нарысаў пра Я. Купалу («На запаветнай зямлі», 1974), М. Багдановіча («У родным краі», 1983), А. Гурыновіча, Ф. Тапчэўскага, М. Чарота, гісторыка-эканам. нарысаў «Маладзечна» (1971) і «Вілейка» (1974).

*Тв.:* Адчыніся, таямніца часу.— Мн., 1984; Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI — XIX стст.— Мн., 1984. *В. У. Скалабан.*

**КАХАНО́ЎСКІ** (Kochanowski) Ян (1530, в. Сыцына каля Радама, ПНР — 22.8.1584), польскі паэт. З 1544 вучыўся ў Кракаўскім, Крулявецкім (г. Кёнігсберг), Падуанскім ун-тах. Пісаў на лац. і польск. мовах. Аўтар паэм «Шахматы» (1566), «Муза» (1567), «Сцяг, або Пруская прысяга» (1569), трагедыі «Адказ грэчаскім паслам» (1578) і інш. Пераклаў «Псалмы Давіда» (1578). Творы на польск. мове (арыентаваныя на еўрап. ўзоры) прасякнуты патрыятызмам («Згода», 1564), у іх узняты тэмы грамадскіх узаемаадносін («Сатыр, або Дзікі муж», 1564). Выдаў 3 кнігі «Фрашак» (1584) — жартоўна-роздумных мініяцюр. Вяршыня яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ